# Пластычныя экспрэсіі Уладзіміра Церабуна

Барыс Крапак



Рэха. Дрэва, 1976.

У выставачнай зале на праспекце Машэрава ў Мінску ў кастрычніку мінулага года працавала выстаўка твораў Уладзіміра Церабуна. У экспазіцыю ўвайшло больш за 60 скульптур і 100 графічных аркушаў. Гэта трэцяя буйная персанальная выстаўка гродзенскага мастака. Як і дзве папярэднія, якія праводзіліся ў Гродне і Маскве, яна зрабілася прыкметнай з'явай у насычаным мастацкім жыцці беларускай сталіцы.

Работы У. Церабуна вызначаюцца высокім узроўнем прафесійнага майстэрства, глыбінёй вобразных і пластычных характарыстык. Цэласнае экспазіцыйнае вырашэнне выстаўкі не перашкаджала ўспрыманню кожнага асобнага твора. А ўвядзенне ў экспазіцыю мадэлюнкаў і фотаздымкаў значна ажывіла выстаўку. Разнастайнасць матэрыялаў, з якімі працуе мастак, спрыяла эмацыянальнаму ўздзеянню твораў. Уражвала цеплыня дрэва, мігценне бронзы, святланоснасць мармуру, пластычнасць шамоту... Вольная расстаноўка скульптур на зграбных подыумах дапамагала адчуць чароўнасць і моц іх прасторавай арганізацыі.

Уладзімір Церабун у беларускую скульптуру ўвайшоў імкліва, нястрымна і, здавалася, ужо цалкам сфарміраваным майстрам. Пятнаццаць гадоў назад ён абараніў дыплом у БДТМІ і адразу ж ажыццявіў яго. За вобразнае вырашэнне мемарыяла на месцы спаленай фашыстамі вёскі Дальва ён быў удастоены прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Гэтая работа прынесла маладому скульптару вядомасць у шырокага глядача.

Жыве Уладзімір у Гродне, пастаянна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках, шмат працуе ў станковай скульптуры, у манументальнай і дэкаратыўнай пластыцы. Менавіта тут вызначыліся яго галоўныя тэмы, творчыя прыхільнасці, якія звязаны з мірам і вайной, з нацыянальнай гісторыяй і сучаснасцю, з лірыкай і эпасам, трагедыяй і драмай.

У. Церабун неяк асабліва востра ўсведамляе пераемнасць і рэальную сённяшнюю значнасць нацыянальных культурных традыцый, у першую чаргу беларускай літаратуры, фальклору, музыкі. Гэты свет увасабляецца ў кампазіцыях «Ясь і Яніна», «Летапісец», «Жалейка», «Сымон-музыка», у якіх выразна адчуваюцца цікавасць мастака да нацыянальнай тэматыкі, яго імкненне выявіць народныя характары і ідэалы.

А побач эксперыментальная, нават экстравагантная кампазіцыя «Рэха», дзе гучыць думка, што аб'ектам скульптуры можа быць не толькі чалавек, але і прадметнаалегарычнае асяроддзе. У гэтай рэчы, разлічанай на 180° агляду, усё звязана з нязвыклым уяўленнем пра круглую скульптуру. Гэта хутчэй наўмыснае ўвасабленне ў пластыцы кампазіцыйнага вырашэння, па сваёй сутнасці блізкага поп-арту.

Але асобасны, лірычны пачатак мастацтва У. Церабуна найбольш ярка праявіўся ў камернай, альбо малой, пластыцы, прадстаўленай на выстаўцы серыяй «аголеных», якія адрозніваюцца і пастаноўкай, і трактоўкай, і матэрыялам, аднак аб'ядназ гармоніяй аб'ёмаў, вытанчанасцю лепкі, унутранай натхнёнасцю. Прыцягваюць і зачароўваюць работы «Купальшчыца», «Восеньская песня», «Бераг», «Адпачынак», «Пачатак», «Раніца», «Жні-





Малюнак аголенай. Аловак, 1986.



Дыптых «Ясь і Яніна». Дрэва, 1987.

вень», «Ноч», «Флора». Па серыі «аголеных» бачна, што мастак адораны густам, пластычным пачуццём, разуменнем фармальных суадносін, веданнем натуры, уменнем уводзіць неабходныя акцэнты ў жэсты, рухі, павароты постаці.

У. Церабун не выказвае, за рэдкім выключэннем, эмоцыі грамадскага характару «ў лоб». Ён імкнецца зыходзіць з чалавечых адносін і пачуццяў.

Мастак гаворыць пра тое, што яго хвалюе асабіста. І якраз гэта цікава ўсім. Сардэчнасць тону, маральны змест твораў, высвечванне ўласных асобасных якасцей, адсутнасць насілля над праўдай жыцця—усё гэта, як і шмат іншага, што здольны казаць творца, калі ён шчыры, не можа не ўздзейнічаць на гледача. Я сам бачыў, як цёпла рэагавалі наведвальнікі выстаўкі на цыкл «ню», на серыю малюнкаў «Ракурсы». Зрэшты, гэта не проста малюнкі «з натуры», не проста імкненне паказаць прафесійнае валоданне алоўкам. Гэта як бы малюнкі-занатоўкі, мастак выказаў толькі тое, што мае дачыненне выключна да яго прыхільнасцей, яго ўласнага свету прафесійных пошукаў. Рэчы здзіўляюць сваёй чалавечнасцю, сваёй кантактнасцю з гледачом. Прастае, штодзённае жыццё, ніякіх табе абстрактнапампезных тэм, жыццё без прыхарошвання, без самалюбавання, без самаабароны.

Урэшце, гэтыя малюнкі — а іх у скульптара сотні — можна разглядаць і як падрыхтоўчыя, і як самастойныя. Іх цікава «чытаць» як пластычны дзённік, які фіксуе пачуццё аб'ёму, разбор суадносін, акцэнтаванне дэталяў, неабходных для вырашэння галоўнага.

Роздумы У. Церабуна «пра час і пра сябе» носяць на выстаўцы зусім не імперсанальны характар. Асэнсаванне рэчаіснасці адбываецца праз жаданне зразумець перш за ўсё самога сябе ў няпростым кантэксце «чалавек і свет», суаднесці ўласныя духоўныя магчымасці з імкненнямі і патрабаваннямі часу. Гэты цвярозы духоўны самааналіз мастака часам хаваецца, асабліва ў станковых сюжэтна-прасторавых кампазіцыях, за вонкава стрыманай рацыянальнай пластычнай формай, настойліва сцвярджаецца ў іншых жанрах.

Сёння Уладзімір Церабун — у складаным пошуку сцвярджэння тых ідэалаў, якімі ён жыве. Напэўна, у яго шмат нязведаных шляхоў. І можна толькі пажадаць яму заставацца верным сабе.